Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ГОЛАС ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 12 — Вільня, Серада 23-га трауня 1928 г. — Год 1

Па загаду Гарадзкога Старасты № II газэты „Голас Працы“ сканфіскаваны за зьмяшчэньне перадавіцы „Што далей“, тэксту „Пратэсту чэскага паступовага грамадзянства ў справе працэсу Грамады“ і карэспандэнцыі „Як моладзь праводзіць час сьвятамі“.

Мае голас дэфэнзыва...

Пад дэфэнзывай у запраўдным значэньні трэба было-б разумець наагул абарону, як гэтае слова палаціне і азначае, у праціўлежнасьць офэнзыве—наступленьню. У дзяржаве існуе пэўная, вядомая ўсім інстытуцыя, носячая гэты назоў і маючая ў сваім залажэньні на мэце „абарону дзяржавы ад унутраных ворагаў“. Дэфэнзыва тое-ж, што было пры царох „Охранка“, „Охранное Отделеніе“. Папулярна ў шырокіх слоях пад дэфэнзывай разумеецца кожная асоба, якая—або проста за грошы служыць у гэтай ўстанове, даносячы на каго патрэбна, або робячы гэта „ідэйна“, бясплатна, у сілу супярэчнасьці інтарэсаў данае асобы з акружаючым яе грамадзянствам. Есьць яшчэ адзін род дэфэнзывы ў папулярным значэньні слова—гэта гэтак зв. *Жоўтая прэса*, якая мае за спэцыяльнае заданьне дэскрэдытаваць, паніжаць у вачох народу і „Охраннога Отделенія“ прэсу ідэйную. Гэта самы горшы від дэфэнзывы ў папулярным значэньні, якую прынята называць *грамадзкай простытуцыяй*.

Што ў нас існуе жоўтая прэса, маючая характар падобнай грамадзкай простытуцыі — ні для кога-ж хіба не зьяўляецца сакрэтам. Гэтую „пачэсную“ павіннасьць у адношаньні да беларускага грамадзянства доўгі час сумленна выпаўняла Паўлюкевічава „Беларускае Слова“, давёўшы сваю „службу“ да абсурду і стаўшыся непатрэбным нікому. Але самая думка аб такой прэсе, ня толькі не загінула, а значна пашырылася. Маем цяпер—„Грамадзянін“, „Беларускі Дзень“ і ўрэшце „Народ“. Розьніца папярэдніцы ды першай з трох наступных газэт, з аднаго боку, з дзьвюма апошнімі—з другога—тая, што каля першых групаваліся і групуюцца людзі, ня маючыя за сабою ў грамадзкім сэньсе што наз. паломанага гроша, кіраўнікі апошніх дзьвюх выстаўляюць сябе людзьмі з пэўнаю грамадзкаю прошласьцю і змагаюцца з кім патрэба „ідэйна“. Сутнасьць справы ад гэтага не мяняецца: і там і тут служаць людзі грамадзкі нічога ня вартыя, сапсутыя, дэгенэраты, якія ні больш ні менш, як выслужваюцца перад сваімі панамі.

Аб'ектам нападкаў для „Народу“ і „Беларускага Дня“ бязумоўна—„ідэйных“ служыць галоўна беларуская радыкальная прэса, як маючая абсолютны ўплыў у масах, і тыя асобы, якія чэсна спаўняюць свой абавязак перад народам. Розьніца між „Народам“ і „Бел. Днём“ тая, што „Народ“ называе гэту прэсу „інтэрнацыянальнай“, укладаючы ў гэтае слова самы горшы зьмест,—„Бел. Дзень“, не саромячыся называе яе проста камуністычнай (а камуністыя, як ведама—самыя горшыя праступнікі ў дзяржаве). У апошніх нумарох гэтых вельмі слаўных газэт зьявіліся чарговыя даносы, робячыя „гонар“ іх аўтарам. Сутнасьць даносу першай газэты можна даведацца з зьмешчанага ніжэй пісьма ў Рэдакцыю д-ра Дварчаніна, да якога мала што можна прыбавіць, каб лепш характарызаваць тварца даносу. Мы толькі можам дзівіцца, да чаго можа даходзіць подласьць людзей, якія да тога ўважаюць сябе навет грамадзкімі дзеячамі, і горача пратэставаць проці нічым непрыкрытай правакацыі ўсяго беларускага працоўнага руху, бо данос мае запраўды такі характар.

Данос „Беларускага Дня“ прыкрываецца „ідэалёгічнаю“ заслонаю, сілячыся ў стацьці „Аб „радыкалах“ і радыкалізьме“ даказаць шляхам акрэсьленьня апошленага буржуазіяй слова—радыкальны (крайні, без кампрамісаў) ды розных софістычных супастаўленьняў, што наша прэса бяз права ўжывае гэты назоў (як ведама, „партыя Умястоўскага“ назвала сябе таксама радыкальнай—толькі ці ня ў адносінах даносаў ды барацьбы з беларускім народам?). Выразы, заканчваючыя стацьцю, сьведчаць аб бясьсільнай злосьці аўтара яе, аднаго з нялічных дэгенэратаў з беларускай інтэлігенцыі, найшоўшых свой „ідэйны“ прыпынак пры „Бел. Дні“, якога сумленьне ў адносінах да свайго ўласнага запраўднага становішча вылілася ў адносінах да так ненавіснай радыкальнай прэсы.

Што-ж? Астаецца пажадаць „паважаным“ „беларускім“ органам вясьці і надалей сваю „пачэсную“ працу, якую народ ужо ацэньвае, як патрэба. Але можам наперад сказаць нашым грамадзкім прастытутам, што мэты сваей, за выпаўненьне якой узяліся—зьнішчэньня беларускай радыкальнай прэсы і таго ўсяго шырокага і глыбокага народнага руху, на якім гэтая прэса дзяржыцца, вы ня толькі не дасягнеце з сваімі „ідэйнымі“ падыходамі, а і самі ў свой час будзеце выкінены, як тая непатрэбная высcаная цытрына. Народ ідзе сваей уласнай дарогай і „лая вашего совсем не примечает“. Калі-ж палажэньне простытутаў вас ганорыць — дык дзяржэцеся далей на сваім слаўным пасту.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

39 дзень працэсу Грамады.

39 дзень працэсу Грамады распачаўся з адчытаньня украінскай брашуры, знойдзенай пры рэвізыі ў Цэнтр. Сэкрэт. Грамады. Пасьля Суд прыступіў да адчытаньня статуту і праграмы Грамады.

Абв. Астроўскі просіць спраўдзіць, ці запраўды ён падпісаў дэклярацыю № 50,000.

Абв. Р.-Міхайлоўскаму—Старшыня Суду зазначае, што дакумэнтаў, аб якіх ён казаў некулькі дзен назад, у дэпазыце турмы няма. **Абв. Р.-Міхайлоўскі** просіць спраўдзіць, каму яны даручаны. Пасьля Суд адчытвае пратакол агляду з паседжаньняў гурткоў на абшары чатырох ваяводзтваў.

Судзьдзя Барэйка—можа Тарашкевіч выясьніць, ці зацьверджаньне статуту Грамады Радай Грамады ёсьць фікцыяй, ці фактам, а такжа—чым тлумачыцца дата ўхваленьня статуту 12. V. 1926 г.

Абв. Тарашкевіч—так, гэта была фікцыя, якая паўстала таму, што статут Грамады быў узараваны на статуце „N. P. Chł.“. Што-ж датычыцца даты 12. V. 1926 г., то ня ёсьць выключанай рэчай у сувязі яе з маёвымі выпадкамі.

Адв. Гонігвіль просіць далучыць да актаў справы праграму P. P. S.

Прак. Раўзэ—ня бачу ніякае сувязі паміж справай Грамады і праграмай PPS і дзеля гэтага прапаную проціў далучэньня праграмы P. P. S.

Адв. Гонігвіль—я таксама ня бачу ніякае сувязі паміж „Крестінтэрнам“ і Грамадой, але не прапанаваў проціў далучэньня статуту яго да актаў нашае справы.

Старш. Суду Аўсянка — аб „Krestinterne“ і „Kominternie“ ёсьць мова на пачатку акту абвінавачаньня.

Адв. Гонігвіль. Так, але на жаль ані Суд, ані абарона ня мелі ўплыву на фармуляваньне гэтага акту.

Старшыня Суду просіць выясьніць, якая сувязь заходзіцца паміж Грамадой і праграмай P. P. S., бо можа — таксама паўстаць квэстыя далучэньня праграмы „Пяста“.

Адв. Гонігвіль — каб я меў пад рукамі праграму „Пяста“ і мог знайсьці аналёгіі з праграмай Грамады, то таксама прасіў-бы Суд далучыць да справы і гэту праграму. Калі-ж ходзіць аб праграму P. P. S, то абарона хоча высьвятліць аналёгіі паміж праграмамі PPS і Грамады.

Суд пастанавіў праграму PPS далучыць да актаў справы.

Пасьля гэтага, Суд у далейшым цягу адчытвае пратакол агляду статуту N. P. Chł. і іншых давадаў рэчовых, знойдзеных ў Цэнтр. Сэкр. Грамады ў Вільні, як напр. лісты Сэкрэтарыяту да сяброў Грамады і г. д.

Судзьдзя Барэйка зьвяртаецца да абв. Бурсэвіча: Макоўскі пісаў, што карэспандэнцыя была аддана да рэдакцыйнай калегіі. Што значыць—„рэдакцыйная калегія“?

Абв. Бурсэвіч.—Пад словам „рэдакцыйная калегія“ разумелася адасланьне карэспандэнцыі да рэдакцыі на імя сэкрэтара рэдакцыі Войціка.

Прак. Раўзэ—ці Ільляшэвіч быў сябром Грамады?

Абв. Бурсэвіч—працаваў у Грамадзе.

40 дзень працэсу Грамады.

Перад распачацьцем справаздачы экспэртаў аб дзеяльнасьці Бел. Банку старшыня Суду Аўсянка задае некалькі пытаньняў абвінавачаным.

Чаму абв. Валошын у дню 1-I 27 г. меў у Бел. Банку 307 дал., як уклад тэрміновы і 21 зл. і 145 дал. на бягучым рахунку. **Абв. Валошын** — я аддаваў усе грошы на ўклад тэрміновы і не магу выясьніць, чаму частка іх знайшлася на бягучым рахунку.

На гэтае-ж пытаньне абв. Тарашкевіч і Рак-Міхайлоўскі выясьняюць, што ўклады тэрміновыя давалі значна большыя працэнты, чым уклады на бягучы рахунак. Аднакжа дзеля таго, што ім хацелася, каб новастворaная беларуская гаспадарчая інстытуцыя разьвівалася лепей, яны ўкладалі частку грошай на бягучы рахунак, хоць за гэта атрымлівалі значна меншыя працэнты.

Па гэтых выясьненьнях распачалі сваю справаздачу экспэрты. На першае пытаньне, пастаўленае Судом — калі распачаў сваю дзеяльнасьць Бел. Каапэр. Банк — адказана: дзеяльнасьць праўная распачалася 14-II 25 г., а практычная 9-XI 25 г. Старшыня Суду задае другое пытаньне: ці лік і род ведзеных кніг суадказваюць агульным аснаваньням бугальтэрыі? Адказ: суадказваюць.

Экспэрт **Гэнэськовяк** сцьвярджае, што на падставе прагледжаных кніг у saldo ня была зацягнута пазіцыя 111 дал. Гэтая справа выклікае жывую дыскусыю і рад пытаньняў з боку пракурора і абароны, скіраваных да экспэрта. Другі экспэрт **Ботта** асьвядчае, што хаця бугальтэрыя Банку была ведзена паводле перастарэлай сыстэмы расейскага казначэйства, аднак-жа ўсе кнігі і бугальтэрыя былі ведзены дакладна.

Абв. Коўш, на пытаньне, што ён ведае аб пазіцыі 111 дал., адказвае, што пазіцыя гэтая была зацягнута ў першай частцы кнігі, якая знаходзіцца ці ў „Urzędzie Skarbowym“, ці ў Банку.

На далейшыя пытаньні Суду экспэрты адказваюць, што яны ня выкрылі ніякіх надужыцьцяў, ніякіх фікцыйных уплываў і запісаў. Адносна асабістых рахункаў Астроўскага і Каўша экспэрты сцьвярджаюць, што яны ня былі фікцыйнымі. Толькі нязначныя дробныя недакладнасьці і то натуры тэхнічнае ўдалася сцьвярдзіць ў цэнтралі і ў аддзеле Банку ў Глыбокім.

Рэасумуючы выясьненьні экспэртаў эксп. **Ботта** канчае гэтак:

У згодзе са сваім сумленьнем і з пачуцьцём усяе адказнасьці сцьвярджаю, што я не знайшоў ніякіх надужыцьцяў у Белар. Банку.

41, 42 і 43 дзень працэсу Грамады.

У далейшым цягу адбываецца экспэртыза бугальтэрыйных кніг Бел. Каапэр. Банку. **Прак. Раўзэ**—ці істотна трэба было, каб пазаставаліся рэзэрвы ў Банку ў высокасьці 40 прац.?

Эксп. Ракоўскі — у 1925—26 г. г. дзеля спадку валюты вымагалася 40 прац. рэзэрвы. Бел. Банк гадавой рэзэрвы ня меў.

Эксп. Ботта—я ня ведаю і не спатыкаўся з такімі пастановамі, якія-б вымагалі 40 прац. рэзэрвы.

Абар. Пятрусэвіч і Крыжаноўскі—можа п Ракоўскі падасьць уставы, якія-б вымагал захаваньня 40 прац. рэзэрвы? Эксп. Ракоўск адказвае, што гэта быў толькі звычай на абшары Віленскага Рэвізыйнага Саюзу.

Адв. Пятрусэвіч—ці ня шкодзіла Белар. Банку тое, што ён ня трымаўся гэтага звычаю? **Ракоўскі** — не, наадварот, гэта памагае Банку разьвівацца. **Прак. Раўзэ**—ці быў такі дзень, калі-б Saldo выносіло 800 дал.? **Ракоўскі**—мне здаецца, што найбольшая сума выносіла 500 дал.

Адв. Крыжаноўскі—ці была тэндэнцыя да ўкрываньня якіх небудзь сум? **Экспэрт**—Не. **Адв. Пятрусэвіч**—кнігі для вэксалёў ня было, але, ці можна даведацца з іншых кніг аб апэрацыях з вэксалямі? Ракоўскі—але, апэрацыі можна лёгка ўстанавіць.

Эксп. Ботта дадае, што да тых апэрацыяў, якія вёў Бел. Банк, навет з фармальнага пункту гледжаньня не патрэбна была спэцыяльная гандлёвая кніга.

Судзьдзя Барэйка просіць абв. Астроўскага выясьніць гісторыю паўстаньня Банку. Астроўскі ў доўгай прамове вычэрпываюча і рачова выясьняе, як паўстаў Банк. Учасьце ў яго арганізацыі прыймаў і пас. Ярэміч. Просіць Суд прагледзець кнігі, якія знаходзяцца ў „Ізбе Скарбовай“. **Адв. Крыжаноўскі** таксама просіць Суд прагледзець гэтыя кнігі. Суд на нарадзе пастанаўляе аддаліць просьбу адв. Крыжаноўскага, матывуючы тым, што выясьненьні экспэртаў і абвінавачаных квэстыю Банку добра выясьнілі.

Адв. Пятрусэвіч просіць Суд далучыць да актаў справы лісты Пігулеўскага. б. дыр. бел. гімн. у Дзьвінску, у якіх ён інфармуе аб спосабе паразуменьня з Транзытным Банкам у Рызе. Лісты гэтыя паказваюць, што ініцыятыва паходзіла ад Пігулеўскага. Цяпер Пігулеўскі ёсьць урадоўцам латвійскага міністэрства.

Адв. Крыжаноўскі просіць аб далучэньні касавых рахункаў Банку за 1925, 1926 і 1927 г. г. Суд, паміма апазіцыі пракурора, пастанавіў гэтыя дакумэнты да справы далучыць. На гэтым кончылася экспэртыза Банку.

Экспэртыза аружжа.

У прысутнасьці экспэрта капіт. 3 п. а. ц. **Валовіча** Суд прыступае да экспэртызы аружжа. Экспэртыза гэта будзіць агульнае заінтарасаваньне. Усе спадзяваліся вялікай колькасьці аружжа, бо „гатовілася-ж паўстаньне на вясну 1927 г.“. Таксама ў часе праводу многа якіх сьведак казала аб складах аружжа. Усіх, аднак-жа, спаткала расчараваньне.

У першую чаргу аглядаецца місьліўская стрэльба, рог з порахам, шрот, і набоі карабіновыя. Экспэрт, на запытаньні Суду, выясьняе, што аднарурка ёсьць перастарэлага тыпу, няздольная да ўжытку і, што датычыцца набояў, дык яны могуць паходзіць з 1920 г.

Старш. Суда Аўсянка — ці ня трэба было шмараваць алівай набояў, каб яны лепей захаваліся? **Экспэрт** — шмараваньне алівай зьяўляецца цяпер непрапісовым пераховаваньнем.

Старшыня Суду—скуль паходзяць францускія набоі? **Экспэрт**—карабіны францускія мела ў 1920 г. наша армія.

Далей аглядаецца аружжа, знойдзенае ў часе ліквідацыі КПЗБ у Цеханах. Агулам знойдзена 9 карабінаў у некалькіх асоб, з гэтых 4 зусім нядатныя да страляньня, 5 менш-больш здатнейшыя, але трэба і гэтыя добра абчысьціць і нашмараваць, каб можна было з іх страляць. Адзін карабін зроблены ў 1920 г. тыпу расейскага, а рэшта ўсе ў 1915 і пазьнейшых гадох. Амуніцыя паходзіла з 1916 г.

44 дзень працэсу Грамады.

У далейшым цягу адчытваліся акты. Са сьведак паклікана вязьня **В. Фрышмана.** У яго знайшлі ў часе рэвізіі рукапісь абв. Акінчыца, які паводле зданьня абвінавачанага быў прызначаны для рэдакцыі „Нашае Справы“. У гэтым артыкуле выясьнялася, як трэба пісаць карэспандэнцыі з вёскі.

Сьв. Фрышман запярэчыў, каб ў яго, калі-небудзь знаходзіўся гэтакі рукапіс Акінчыца. Гэта тым больш зьяўляецца загадкай, калі прыпомніць, што ў 1926 г. у рэдакцыі „Нашае Справы (Віленская 12-6) была зроблена крадзежа. Адчытваюцца паказаньні сьведкаў Баярскага, Выганоўскае, Даёна, Канчарука, якіх няпрыбыцьце на суд прызнана за ўсправядлівёнае.

Сьв. Выганоўская паказвае, што ў яе была куплена жыўнасьць для палітычных вязьняў, прабываючых у гарадзенскім вастрозе.

Сьв. Баярскі быў старшынёю гуртка і канфідэнтам паліцыі. Яго доўгае паказаньне нічога новага да справы ня ўносіць. Паміж іншым сьведка гаворыць, што хтосьці з сяброў вясковага гуртка быў вызначаны камандуючым усей артылерыяй на час паўстаньня, што ў Ваўкавыскім павеце прыгатоўлена 60 тысячаў карабінаў і г. д. Аб адным з беларусаў, навет не належаўшым да Грамады, сьведка гавора так: „беларус з перакананьня, а значыцца праціўнік Польшчы нагул".

Экспэрт капітан Бургарт з II Аддз. Ген. Штабу паказвае пры зачыненых дзьвярох.

Ад імя абароны забірае голас адв. Гонігвіль і просіць Суд адчытаць урадавыя нататкі сьледчага судзьдзі адносна да паказаньняў сьведкі Вышынскага Вацлава. Просьбу сваю адв. Гонігвіль матывуе так: для Суда важнай акалічнасьцю зьяўляецца ня толькі тое, што сьведка гавора, але і кім сьведка ёсьць. Вось-жа ў працэсе, які некалькі дзён назад адбыўся ў Варшаўскім Акружным Судзе, на лаве абвінавачаных заселі зачыншчыкі ня выкананага падкопу. Паміж імі знаходзіўся В. Вышынскі, ёнжа Закжэўскі, за якім былі разасланы гончыя лісты. Абарона пераконана, што В. Вышынскі ў гэнай справе і сьведка ў працэсе Грамады—адна і тая самая асоба.

Прак. Калапскі апануе проці ідэнтыфікаваньню Вышынскіх, але ня мае нічога проціў адчытаньня нататкі. Суд адчытвае тры нататкі. З першае відаць, што баданьне было перарвана дзеля познае пары, з другой—баданьне перарвалася дзеля таго, што Вышынскі выехаў з Беластоку, з трэцяе—баданьне не магло адбыцца, бо Вышынскі выехаў з Беластоку і невядома дзе знаходзіцца. Нататкі адносяцца да 1—5. VII. 26. Па адчытаньню нататкі адв. Гонігвіль асьвядчае, што зьмест гэтых нататкі тым больш пераконвае абарону ў ідэнтычнасьці асобаў Вышынскіх, што 29. II. 26 г. быў выкрыты падкоп і ў першых днях ліпня былі разасланыя лісты. Просіць такжа Суд зьвярнуць увагу на тое, што гончыя лісты былі выасланы за В. Вышынскім vel Закжэўскім (Газэта Сьледчая № 1045, паз. 18). Век і рысапіс паказваюць, што гэта адна і тая самая асоба.

Суд прыстае на прапазыцыю абароны і ў далейшым цягу адчытвае дакумэнты. Адчытваюцца карэспандэнцыі, забраныя на пошце да сэкрэтарыяту і да рэдакцыі. Большасьць лістаў да рэдакцыі — гэта паведамленьні аб высылцы грошы, або просьбы аб разлажэньню на раты падпіснай платы.

45 дзень працэсу Грамады.

Суд канчае разглядаць рэчавыя довады. Судзьдзі і пракуроры задаюць рад пытаньняў абвінавачаным, датычачых некаторых дробных квэстыяў. Абвінавачаныя выясьняюць. У ліку прысутнай публікі знаходзіліся на салі Суду паслы з камуністычнай фракцыі: Варскі, Бітнэр, Рояк, Гаўрон і Валіцкі з украінскага „Сельробу"—лявіцы.

Па загаду перарыву пас. Варскі крыкнуў па адрасу абвінавачаных: „Ад імя работніцкае Варшавы — чэсьць абвінавачаным Грамады". Ад імя Лодзі тое самае сказаў Бітнэр. Ад імя Украінскага люду прывітаў пас. Валіцкі. Старшыня Суду загадаў выдаліць з Суду дэманстрацыйных паслоў.

Абв. Бурсэвіч, Акінчыц гавораць, адказываючы на пытаньні пракурора, што анікімі грашмі ад „Kominternu" не распараджаліся і ніколі ня былі каранымі за камуністычную дзеяльнасьць.

Старшыня Суду абвяшчае, што судовае сьледзтва кончана і Суд прыступае да выслуханьня прамоваў старон: пракуратуры і абароны. Старшыня Суду зьвярнуў увагу, што прамовы будуць адбывацца пры адчыненых дзьвярох, за выняткам квэстыі канфэрэнцыі ў Гданску. Кожная старана, як толькі захоча гаварыць аб ёй, мусіць папярэдзіць Суд, каб Старшыня мог зачыніць дзьверы. Хто не падпарадкаваецца яго загаду, той будзе пазбаўлены слова.

46 дзень працэсу Грамады.

У суботу скончыўся судовы правод. Старшыня Суду заяўляе, што прамовы старон будуць адбывацца пры адчыненых дзьвярох, за выняткам мамэнту гданскае канфэрэнцыі.

Голас забірае прак. Раўзэ.

Прамова пракурора Раўзэ.

Высокі Суд! У змаганьні, якое адбываецца на бел.-літ. землях не вядома, хто паканае, ці дзікі Усход, ці культуральны Захад. Высокія судзьдзі, вы судзіце сяньня тых палітычных дзеячоў, якія кіраваліся на Усход. Людзі, седзячыя на лаве абвінавачаньня, абвінавачваюцца ў зарганізаваньні сьпіску з мэтай выклікаьня аружнага паўстаньня. Людзі гэтыя забавязаліся перад суседняй дзяржавай, каб атрымаць яе помач.

Расейская рэвалюцыя выказала супярэчнасьць інтарэсаў места і вёскі. Выказала, што пралетарыят места ня зможа перабудаваць грамадзкага ўстрою бяз помачы вёскі. Згэтуль ідзе высілак, каб узгодніць працу места з вёскай. У 1923 г. паўстае „Krestintern"—сялянская міжнародная арганізацыя. Адсюль, як сьцьвердзілі сьведкі Бабіч і Гурын, бярэ свой пачатак дзеяльнасьць Грамады і N. P. Chł. У камуністычны інтэрнацыянал кажа зьвяртаць пільную увагу на нарадавасьцёвыя пытаньні. Рэзультатам гэтага змаганьня — злучэньне белар. земляў з Радавай Расеяй. Гэткае становішча занялі кіраўнікі Грамады. Сьцьвердзілі гэта сьведкі Бабіч і Гурын.

Далей пракурор абгаварвае даволі падрабязна квэстыі, зьвязаныя з існаваньнем ураду Ластоўскага і пераходзе да праскае канфэрэнцыі, якая адбылася ў 1921 г. У канфэрэнцыі гэтай прыймаў учасьце і абв. Тарашкевіч. Прызнала яна ўрад Ластоўскага за рэпрэзэнтанта белар. народа. Грамада — гэта высілак да стварэньня адналітае палітычнае лініі. Удаецца гэта вельмі лёгка. Адбываецца канфэрэнцыя ў Бэрліне з учасьцем прадстаўнікоў Мінска, Прагі, Бэрліна, Польшчы пад старшынствам Ульянава. Наступствам было абвяшчэньне праз Радавую Беларусь амнэстыі для ўсіх беларускіх дзеячоў.

Усход паканаў, а народ беларускі, паводле майго зданьня быў праданы. Мусіў толькі наступіць апошні акт, каб запанаваў шатан: трэба было парваць з краем, культура якога падбіла (заваявала) сэрца маладога барбара Тарашкевіча.

Грошы і перадусім грошы адыгрываюць тут вялікую ролю. Дзеля гэтага „Wielki mistrz" (Рады) арганізавалі помач у форме Белар. Банку. Ведаем, што квота 15 тыс. даляраў была абяцана. Ведаем, хто бярэ ўчасьце ў гданскай канфэрэнцыі. На чале Банку стаяць філёлёг, тэолёг і матэматык. Усунулі „бацьку" Банку Ярэміча, бо гэта—палітычны вораг.

Пракурор абгаварвае далей апэрацыі Банку і магчымасьць перасыланьня ў канвэртах з карэспандэнцыяй чэкаў на пэўныя сумы, прадназначаныя на акцыю Грамады. Пракурор даходзіць да выводу, што сума ўкладаў раўняецца суме 15 тыс. даляраў, атрыманай у Гданску. Калі абарона будзе казаць, што ў Банк укладана і выбірана грошы, то я скажу, што гэтага ня ведаю. Я толькі ведаю, а сказаў гэта Гурын, што ў Банк уплыло 15 тыс. даляраў. Абгаварваўшы дзеяльнасьць Банку, пракурор прыходзе да выводу, што Банк гэты не паўстаў з ашчаднасьці.

На чале Банку стаіць выбітная індывідуальнасьць (асабістасьць)—філёлёг, матэматык і сталяр (Астроўскі сам працаваў, як сталяр пры рамонце лавак у Белар. Гімназіі). Зьяўляецца ён (Астроўскі) адначасна арганізатарам Т-ва Белар. Школы — другой лініі акопаў.

Шнаркевіч Язэп кажа, што ён зьяўляецца праціўнікам палітычнае працы, а толькі прызнае працу культурна-асьветную. Але Гурын кажа, што Шнаркевіч прыймае ўчасьце ў канфэрэнцыі гданскай і што зьяўляецца сябрам КПЗБ.

Трэці сябра ўраду Банку — Коўш зьяўляецца ксяндзом новае даты. Подпіс гэтага ксяндза знаходзім побач з подпісамі камуністычных паслоў на лісьце з жаданьнем амнэстыі.

„Мірная рэвалюцыя" румынскага сялянства—проці ураду.

„Марш на Бухарэст".

Ужо са два гады ідзе ў Румыніі барацьба апазіцыйных партыяў, пераважна — наймацнейшых з іх г. зв. — сялянскай, — з урадам так-званых „лібэралаў".

У апошнія часы амаль ня ўсе апазіцыйныя партыі аб'ядналіся ў барацьбе проці ўраду і аднагалосна пачалі трэбаваць — адстаўкі ўраду і назначэньня новых выбараў, даводзячы, што настрой у краі — ад часу апошніх выбараў—зьмяніўся канчальна, завастрыўшыся страшэнна проці ўраду. Запраўды-ж, усе наглядчыкі румынскіх падзеяў сьцьвярджаюць, што яшчэ ня было ў Румыніі ўраду, які быў-бы так ненавіджаны насяленьнем, як гэты ўрад малодшага Братыяну. Гэты ўрад, як і яго папярэднік, урад старшага Братыяну,—экспазытура найвялікшых абшарнікаў, з якіх, напрыклад, „фаміліі Братыяну" належаць цэлыя вялізарныя паветы ў краі, якія дзеля таго-ж адкрыта і цынічна зусім выключаны з абшараў, на якіх паведзена сяк-так зямельная рэформа. Урады абодвух Братыяну і ў іншым зусім „парумынску" карысталіся ўладай: „лібэралы" захапілі ўсе цёплыя мейсцы ў краі, разглядаючы яго насяленьне, а перадусім — сялянства, як дойную карову. Усё гэта ўсьцяж абурала сялянства, паднімала ў ім апазіцыйны, а ў апошні час і „рэвалюцыйны" настрой. Праўда, гэты „рэвалюцыйны настрой" неяк ужываўся з манархічнымі імкненьнямі дый агітацыяй на карысьць павароту ў край выгнанага бацькам прынца Кароля, які, седзячы ў Парыжу, пільна сачыў — праз сваіх агентаў-павадыроў гэтай сялянскай партыі—за „рэвалюцыйна-манархічным рухам" у краі, рыхтуючыся — у кожны мамэнт быць нагатове зьявіцца сярод „свайго вернага народу".

І вось, павадыры сялянскай партыі, ня здолеўшы „пераканаць" лібэралаў, каб яны самі зракліся ўлады, пастанавілі сьпярша змусіць урад назначыць новыя выбары, узарваўшы парлямант. Дзеля таго ўся апазіцыя пасьля доўгай бясплоднай барацьбы з урадам у парляманьце,—пастанавіла—адклікаць усіх сваіх паслоў з парляманту. У парляманьце асталася толькі ўрадавая партыя лібэралаў. Але і гэта не падзеяла на дарваўшыхся да ўлады „лібэральных" абшарнікаў, якія добра разумеюць няўхільны свой правал на выбарах. Тады апазіцыя пастанавіла перанесьці барацьбу з парляманту ў край. Пачаліся сходы, мітынгі, дэманстрацыі па ўсяму краю,—з аднолькавымі рэзалюцыямі—аб адстаўцы ўраду. Але не падзеяла і гэта: урад, апіраючыся на войска і паліцыю, навет і ня думаў зракацца ўлады.

Тады павадыры сялянскай партыі надумалі нешта нячуванае ды нябывалае яшчэ здаецца нідзе. Яны пастанавілі склікаць у месьце Альба-Жуліа вялізарны сход, ці кангрэс—у ліку ста тысячаў сялянскіх дэлегатаў з усяго краю, каб—пад націскам рэзалюцыі такога сялянскага сходу, выражаючага волю вялізарнай большасьці насялен. краю—змусіць урад выйсьці ў адстаўку.

І вось гэты вялізарны сход сялянства адчыніўся 5-га траўня. У места Альба-Жулія зьехалася шмат карэспандэнтаў ад загранічных газэтаў, якія вельмі зацікавіліся гэтай праявай „мірнай рэвалюцыі" ў Румыніі. І запраўды-ж, карэспандэнты гэтыя сьцьвярджаюць, што—у сялянскіх масах Румыніі пануе салідарны рэвалюцыйны настрой, але сьцьвярджаюць і тое, што—павадыры сялянскай партыі зусім ня маюць адвагі стаць на чале гэтага актыўнага сялянскага руху. Карэспандэнт аднэй з нямецкіх газэтаў апісвае, у якім парадку маршыравала з усіх бакоў Румыніі ў гэтае места сходу „мірнае сялянскае войска", якая жалезная дысцыпліна панавала ў ім. Запраўды-ж зыйшлося з усіх канцоў краю—каля ста тысячаў хлебаробаў. У часе кангрэсу прамаўлялі аратары адначасна з 6 трыбунаў.

Пад націскам сабраўшыхся, кангрэс абвясьціў сябе „вялікім сабраньнем румынскага народу", заявіўшы, што ніхто іншы ў краі, як толькі кангрэс яго сялянства, ня мае права рэпрэзэнтаваць волю насяленьня. Пасьля прамоваў, кангрэс злажыў прысягу, у якой адзначыў, што — ня спыніць барацьбы, пакуль сучасны ўрад, які насільствам над паміраючым каралём змусіў яго падпісаць назначэньне міністраў, ня выйдзе ў адстаўку. Пасьля прысягі правінцыяльныя павадыры сялянскіх арганізацыяў высунулі думку, падхопленую ўсім зборам, — каб усей грамадой „іосьці паходам на здабыцьцё Бухарэсту". Як ведама, нешта падобнае зроблена было ў 1922 годзе падобным фашыстаўскім кангрэсам „чорных кашуляў", які таксама раптам прыняў пастанову „маршу на Рым", узяўшы ўрэшце Рым—зусім навет бяз бою.

Але галоўны павадыр сялянскай партыі, пасол Маніу, страшэнна перастрашыўся такой „рэвалюцыйнай думкі". Ен заявіў, што—„ня хоча мець нічога супольнага з такімі рэвалюцыйнымі крокамі. Тады на чале сялянскага „паходу на Бухарэст" сталі самі правінцыяльныя павадыры сялянскіх арганізацыяў: Паповіч, Боку, Дробэску і інш. І вось, 7-га траўня пачаўся вялізарны паход сялянскага кангрэсу—лікам у сто тысяч сяброў—на сталіцу Румыніі. Авангард паходу—у 3.000 чалавек выехаў на аўтамабілях і аўтабусах — пад павадырствам Паповіча. Рэшта мае ісьці пехатой. Усе часткі маюць сабрацца пад сталіцай, тутака аб'яднацца, і разам у поўным парадку ўвайсьці ў сталіцу. Чым скончыцца гэты цікаўны крок румынскага сялянства, гэты новы, мірны прынамся пакуль-што, спосаб барацьбы яго проці ўраду, хутка пабачым.

У кожным разе зьявішча вельмі цікаўнае і характэрнае ў нашы часы—прабуджэньня сялянства, сьведамага пачуцьця ім сваей масавай сілы, дый шуканьня ім тых формаў, у якіх яно магло-б прымаць сталае актыўнае ўчасьце ў палітычным жыцьці краю.

Ці толькі павадыры румынскага сялянства акажуцца на вышыні выпаўшай на іх долю акцыйнай ролі, дый ці не скончыцца ўся гэта „мірная рэвалюцыя"—абвешчаньнем прынца Кароля—каралём Румыніі?

Бо-ж з Лёндану, дзе сядзіць цяпер гэты кандыдат на румынскі трон, ідуць весткі, што ён хоча—на аэраплане ляцець у Румынію, але вось толькі—ангельскі ўрад не дае дазволу ўласьнікам аэрапланаў пазычыць прынцу Кароля—рабіць у Румыніі—„манархічную рэвалюцыю".

Ува ўсякім выпадку румынскія манархісты рызыкуюць шмат чым.

Польска-літоўскія перагаворы.

Камісія бясьпечнасьці і адшкадаваньняў закончыла працу.

Літоўская дэлегацыя не прыняла польскага праекту „трактату ўзаемнай гарантыі".

Карэспан. „Кур. Варш." даносіць з Коўны, што „літоўская дэлегац. прызнала польскія праекты аб узаемным ненападзеньні і арбітражу (палюбоўных судох у спорах) не еуадказнымі, як падстава для дыскусіі". Гэта значыць—адхіліла іх. Такім чынам 12-га траўня закончылася першая фаза працаў камісіі, і 13./V. польская дэлегацыя выехала з Коўны дамоў.

Старшыня польскай дэлегацыі п. Голувко аб рэзультатах працы камісіі.

Старшыня польскай дэлегацыі п. Голувко—у гутарцы з прадстаўніком „ПАТ" высьвятліў значэньне ўсяго таго, што зроблена ў Коўні камісіяй. Ён падчыркнуў перадусім важнасьць беспасрэднага спатканьня прадстаўнікоў абодвух урадаў, супольную асабістую працу іх над усімі матэр'яламі і праектамі, наступленьне да разгляду ўзаемных прэтэнзіяў,—замест таго, каб—як гэта было дагэтуль,—высылаць сухую перапіску—шляхам абмену нотамі, ці „размаўляць" праз трэціх асобаў.

Літоўцы ня прынялі нашага праекту „трактату аб узаемным ненападзеньні", сказаў ён. „Мы думалі, што нашым праектам даем літоўцам запэўненьне нашай да іх пашаны. Бо-ж літоўцы ўсьцяж вінавацяць нас, быццам мы лятуцім аб ваенным паходзе на Літву. Дык наш праект рашуча кладзе канец гэтым падазрэньням. Але—калі літоўцы жадаюць шляхам трактату аб узаемнай гарантыі — ізноў падняць віленскую справу, тады—ізноў пачнецца старая гісторыя, якая ні да чаго карыснага не давядзе".

У канцы п. Голувко дадаў, што ў хуткім часе мае распачацца праца другой камісіі—эканамічнай,—ужо ў Варшаве.

Грамадзяне! Памажэце пагарэльцам!

Вёска Скіпоравічы, Казлоўскае воласьці перад сьвятамі, а вёска Акунінава, Дзявяткаўскае воласьці ўжо пасьля сьвят зьнішчаны пажарам. Пажары былі такія страшныя, што навет ёсьць і людзкія ахвяры.

Дык грамадзяне! памажэце сваім няшчасным братам! Ня дайце іх дзеткам распаўзьціся з торбамі па сьвету! Складайце ахвяры, хто чым можа, і адвозьце пацярпеўшым. Гурткі Т-ва павінны ў найбліжэйшым часе паставіць па аднаму спэктаклю на карысьць пагарэльцаў, даход ад якога можна пераслаць і праз Акружную Управу.

Слонімская Акружная Управа.
Слонім, Ражанская 55.

Афіцыяльны супольны камунікат — у справе працаў камісіі.

12-га траўня польская і літоўская дэлегацыі выдалі супольны камунікат, які сьцьвярджае, што літоўская дэлегацыя даручыла польскай свой адказ на польскі праект гарантыйнага трактату і на польскі праект арбітражнай умовы. Пасьля гэтага—„у супольным паразуменьні было пастаноўлена, што наступнае паседжаньне камісіі бясьпечнасьці і адшкадаваньняў адбудзецца ў Коўні 25-га чэрвеня".

Такім чынам перарыў працы камісіі ня трэба разумець, як канчальную няўдачу паразуменьня ў справе бясьпечнасьці. Тым больш, што камісія мае толькі падрыхтаваўчы характар, дый апрацоўвае толькі праекты, якія пасьля будуць разглядацца ў пленарным сходзе дэлегацыяў у Кэнігсбэргу.

Ці была ў Коўні проці-польская дэманстрацыя, ці не?

У тэл. 9-га г. м. „ПАТ" паведам., што—„усе чуткі ў прэсе аб быццам арганізаванай у Коўні дэманстрацыі проці-польскай дэлегацыі,—цалком пазбаўлены ўсялякай падставы ды мінаюцца з праўдай".

Але — 12-га траўня „ПАТ" даносіць: „Перад выездам польскай дэлегацыі—рыхтаваная („заповедзяна") ўжо ад тыдня проціпольская дэманстрацыя, спыненая дагэтуль у зародку паліцыяй, дайшла ўсё-ж да скутку. Перад готэлям, дзе месьцілася польская дэлегацыя, сабралася групка моладзі — у некалькі чалавек, якая выдавала варожыя крыкі. Дэманстрацыя трывала ўсяго некалькі мінутаў".

Пасьля сэсіі Рады Лігі Нацыяў.

Парыская радыё-тэлеграма даносіць з Бэрліну, што польска-літоўскія перагаворы не далі пажаданага рэзультату — бо літоўцы ўсьцяж займаюць непрымірымую пазіцыю. Перагаворы пярэрваны і маюць быць узноўлены ўжо пасьля сэсіі Рады Лігі Нацыяў, на павестцы якой пастаўлена справа—польска літоўскага канфлікту.

10-тыя ўгодкі незалежнасьці Літвы.

15-га траўня ў Коўні ўрачыста сьвяткаваліся 10 тыя ўгодкі існаваньня незалежнай Літвы.

У зьвязку з гэтым урад Вальдэмараса выдаў маніфэст да літоўскага народу, падпісаны ўсімі міністрамі. У маніфэсьце, як даносіць „АТЕ", ёсьць такое мейсца — аб Вільні:

„Значная частка нашага краю, з сталіцай Вільняй, заграблена нашым злым суседам. У Вільні была абвешчана незалежнасьць Літвы, і ў акце аб незалежнасьці Вільня прызнана сталіцай Літвы. Але насільства і ашуканства заграбіла ў Літвы Вільню. Але—увесь народ ведае, што гэта — ненадоўга. Дзеля таго літоўскі ўрад уключыў у Літоўскую Канстыт. параграф, які кажа, што — сталіцай Літвы зьяўляецца Вільня".

Як бачым,—не дае супакою ні польскім, ні літоўскім імпэрыялістам красуля-Вільня, кругом якое жывуць зусім ані літоўцы, ані палякі, а беларусы. Цікава, што-ж з гэтага ўсяго выйдзе.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

З Сойму.

У аўторак, 15 траўня, адбылося VIII з чаргі пленарнае (агульнае) паседжаньне Сойму. Спачатку былі праслуханы цэлы рад дагавораў з іншымі дзяржавамі, якія адасланы ў камісію. Пасьля адбылася даўжэйшая дыскусія ў справе выдачы праз Сойм камуністычнага пасла Сахацкага, пад час якое, нарэшце, быў даны голас і прадстаўніку клюбу „Змаганьня" — паслу Я. Гаўрыліку, (прамову яго за бракам месца зьмесьцім у наступным нумары). Пас. К. Вальніцкі з Сель-Робу—лявіцы зажадаў паіменнага галасаваньня, але ўсё-ж такі яно адбылося толькі шляхам уставаньня.

Проці выдачы галасавала — 160 паслоў, за выдачу—165. Такім чынам пасол Сахацкі быў выданы Соймам, як у свой час Грамадаўскія паслы, у рукі ўлады.

Наступнае пленарнае паседжаньне Сойму адбудзецца 22-га траўня.

ППС-ы ў дэфэнзыве.

Варшаўскія газэты падаюць, што Бэлцікоўская маніцца падаць у суд рэдакцыю ППС-аўскага „Работніка" за абразу і зганьбеньне (zniesławienie) ў прэсе.

Далей варшаўская прэса падае, што паводле апублікаванага ліста Бэлцікоўскай, сябра ППС, пасол Маліноўскі ўжо даўно (!), як служыць у дэфэнзыве і што аб гэты партыя знала, але тры разы рабіла яго паслом. (Ці не за гэта?!! Рэд.). Апроч гэтага, аўтарка кажа, што і іншыя паслы ППС служаць ў дэфэнзыве.

Вось дык абаронцы работнікаў!

Маральнасьць ППС-аў.

Газэты падаюць аб цікавым выпадку ў Ломжы. Да гутарачай на вуліцы ўдавы Аляксандры Высмулак падыйшоў Гэнрык Чарнэцкі і некалькі разоў так моцна яе ўдарыў, што жанчына ўпала („przewróciła się").

На паднятыя крыкі выбяг з свайго памяшчэньня доктар М. Чарнэцкі, ППС-аўскі пасол у Сойм, брат Гэнрыка. Браты супольна пусьціліся за ўцякаючай жанчынай аж на панадворак нейкага Вэйраха. Там пасол-доктар пагражаў Высмулковай за тое, што быццам яна намаўляла яго пацыентаў лячыцца ў іншага доктара.

Ці-ж дзіва пасьля гэтага, што ППС—паслы служаць у дэфэнзыве?!.

Лік безработных.

Па даных дзяржаўных урадаў пасярэдніцтва працы, ад 28 красавіка да 5 траўня г. г. зарэгістравана 148,508 безработных.

Умова ў вугальным промысьле.

У сувязі з умовай, закончыўшайся 1-га траўня г. г., адбылася нарада Саюзу гарнякоў і вугальных прамыслоўцаў. Прамыслоўцы зажадалі рэвізіі ўмовы, на варунках пагаршаючых становішча работнікаў. Саюз гарнякоў зажадаў 20 прац. падвышкі платы і цэлага раду папраўак. Да паразуменьня не дайшло і цяпер пануе „бязумоўшчына"! Да чаго яна давядзе—паглядзім.

Заграніцай.

Магчымасьць устанаўленьня нармальных адносінаў між Чэха-Славакіяй і ССРР.

Маск. карэсп. „Кур. Варш." даносіць, што справа ўрэгуляваньня дыплёматычных адносінаў паміж Чэха-Славакіяй і ССРР значна пасунулася наперад. Перагаворы маюць распачацца ўжо ў гэтым чэрвені—у Вені.

Сэнсацыйныя рэвэляцыі.

Сэнсацыйныя рэвэляцыі, як даносіць „Кур. Варш.", робіць нямецкая прэса — у справе пабыту англійскага міністра лёрда Бэркэнхэда ў Бэрліне. Гэты лёрд Бэркэнхэд зьяўляецца прыхільнікам больш рашучай акцыі Англіі проці ССРР, як тая залішне ўмеркаваная палітыка „чаканьня дый падрыхтаваньня", якой трымаецца Чэмбэрлен. Лёрд Бэркэнхэд—побач з Чэрчылям і інш.—зьяўляецца актыўным кіраўніком тэй часткі англійскага ўраду, якая быццам мае, скінуўшы Чэмбэрлена, распачаць гэтую акцыю вельмі рашуча. У Бэрліне л. Бэркэнхэд зрабіў ведамыя публічныя заявы аб тым, што ён прыехаў запрапанаваць нямецкаму ўраду—выступленьне проці ССРР.

Гэтыя заявы выклікалі вялікую сэнсацыю і рад запярэчаньняў з боку англійскага і нямецкага ўрадаў. Цяпер нямецкая прэса даведалася, быццам л. Бэркэнхэд закупіў у Нямеччыне на вельмі значную суму—акцыяў нямецкай ваеннай і хімічнай прамысловасьці. Прэса цьвердзіць, быццам — за плячыма Бэркэнхэда стаіць англійскае марское міністэрства, ведамая англійская фірма, будуючая караблі (Армстронга), а таксама—група палітыкаў, якія вядуць актыўную палітыку проці Радаў, маючы—дзеля націску на Нямеччыну — зьвязаць цясьней яе ваенную прамысловасьць з англійскай і францускай, уцягнуўшы такім чынам Нямеччыну ў англа-францускую проці-радавую палітыку.

„Палажэньне ў Румыніі".

Пад такім загалоўкам бэрлінскі карэсп. „Кур. Варш." даносіць. — „Карэспандэнты ўсіх нямецкіх газэтаў з-над румынскай граніцы дый з Букарэшту прадстаўляюць палажэньне ў Румыніі вельмі грозным.

„Бэрлінэр Тагэблат" (орган дэмакратаў) называе рух сялянскіх масаў у Румыніі — „паходам дэмакратыі проці гвалтаў рэакцыі" і прыхільна вітае гэты рух, варожачы яму перамогу. Газэта цьвердзіць, што румынскія сяляне датрымаюць прысягі, дадзенай у Альба Жулія і здабудуць Букарэшт.

„Фосішэ Цэйтунг" верыць у магчымасьць кампрамісавага вырашэньня канфлікту—шляхом стварэньня супольнага з апазіцыяй ураду.

Палітычныя колы Бэрліну наадварот — ня вераць у магчымасьць паважных камплікацыяў, спадзяючыся хуткага супакаеньня".

Альбанскі ўрад выйшаў у адстаўку.

Альбанскі ўрад Ахмэд-Зогу выйшаў у адстаўку. Што крыецца за гэтым манэўрам, яшчэ ня відаць. Ведама-ж, што Ахмэд-Зогу пасаджаны і трымаецца пры ўладзе воляй Мусоліні, якога зьяўляецца пакорнай прыладай.

У Прусіі канкуруюць на выбарах 29 сьпіскаў.

Камісія па выбарам у Прускі Сойм зацьвердзіла 29 выбарных сьпіскаў. У 1921 г. на выбарах канкуравала толькі 12 сьпіскаў, у 1924 г.—16. У гэтых выбарах заявіла аб учасьці—аж 30 партыяў і групаў.

На кітайскім тэатры вайны

Наступленьне Чанг-Кай-Шэка на Пэкін.

Апошнія тэлеграмы кажуць, што наступленьне паўдзённых войскаў на поўнач зусім ня спынілася з прычыны аружнага канфлікту, амаль не вайны з Японіяй. У Лёндане атрымана вестка, што паўдзённая армія—у сваім маршу на Пэкін заняла ўжо места Ян-Доу, якое ляжыць на паўдарозе з Ву-Боу да Цянь-Дзіна, гэта значыць—адрэзала значнай частцы паўночнай арміі шлях адступленьня на Цянь-Дзін і Пэкін.

На прапазіцыю Чанг-Тсо-Ліна—спыніць наступленьне ды паразумецца, — бо ён „адцягнуў сваю армію напоўнач", Чанг-Кай-Шэк не адказаў нічога, ці адказаў — фарсаваным наступленьнем. Армія паўдзенная бярэ шмат палонных і вялікія ваенныя здабычы—ідучы па сьлядох уцякаючых арміяў Чанг-Тсо-Ліна.

Калі гэтыя радкі будуць чытацца, паўдзённыя арміі пэўне-ж будуць ужо валадаром Цянь-Дзіну, калі навет ня Пэкіну, які—вельмі блізка ад апошняга. У Цянь-Дзіне стаяць значныя адрады чужаземцаў: 4000 жаўнэроў амэрыканскіх, 3000 францускіх, 1000 англійскіх і 500 японскіх.

Амэрыка прапануе пасярэдніцтва.

Амэрыканская прэса даносіць, што ўрад Куліджа даручыў свайму консулу ў Тсі-Нан-Фу, каб той памацаў грунт—ці не згадзіліся-б абедзьве староны—паўдзённа-кітайская і японская—перадаць свой канфлікт на асабісты арбітраж (палюбоўны суд) гэтага консула. Амэрыканскі ўрад быццам падчыркнуў, што консул мае выступіць з прапазіцыяй — „прыватна", але—не ад імя ўраду Злучаных Штатаў.

„Кур. Поранны" аб амэрыканска-японскім паразуменьні.

„Кур. Поранны", пішучы аб кітайска-японскім канфлікце, выражае прыпушчэньне, што паразуменьне між Амэрыкай і Японіяй азначае — жаданьне іх моцна ўгрунтавацца ў Кітаі, падзяліўшы між сабой „пасы ўплываў". Але, слушна дадае, што гэтае паразуменьне ня будзе трываць доўга, — бо-ж—канчальны, рашучы канфлікт між Амэрыкай і Японіяй—неадхільны.

Маскоўская прэса аб канфлікце.

Таксама і маскоўская прэса—піша, што акупацыя японцамі паўвострава Шантунгу можа выклікаць вельмі паважны канфлікт між Японіяй і Амэрыкай. У „пратэст Англіі" проці японскай акупацыі маскоўская прэса ня верыць: наадварот—Англія была-б вельмі здаволена, каб паміж Амэрыкай і Японіяй дайшло-б ужо ўрэшце да вайны. — Тады-б абодва гэтыя канкурэнты Англіі ў панаваньні на акіянах—надоўга-б зьліквідавалі адзін аднаго ў вывіку ўзаемнай вайны.

Адступленьне Чанг-Тсо-Ліна па ўсей лініі.

У Маскве быццам атрымана вестка з Мукдэну, што Чанг-Тсо-Лін даў загад сваей арміі—адступіць па ўсей лініі.

Эвакуацыя Пэкіну.

Маскоўская прэса паведамляе аб распачаўшайся эвакуацыі Пэкіну—урадавых і іншых установаў у Мукдэн.

Японскія варункі Чанг-Кай-Шэку.

Венская прэса даносіць з Токіо, што — японскі ўрад загадаў спыніць ваенную акцыю японскага акупацыйнага адраду—пасьля заняцьця ім Тсі-Нан-Фу і чыгункавай лініі, лучачай яго з японскай базай Тсінг-Тау.

Японскі ўрад паставіў Чанг-Кай-Шэку варункамі: адшкадаваньне за страты і ўкараньне віноўных кітайскіх жаўнэроў і афіцэраў.—Калі гэтыя варункі будуць прыняты, Японія... пакіне ўсьцяж акупацыю занятай кітайскай тэрыторыі, як застаў ды гарантыю выкананьня варункаў. Усялякае пасярэдніцтва Лігі Нацыяў Японія рашуча адкідае...

Наша хроніка.

Пратэсты ў справе суду над Грамадой. Апрача зьмешчанага ў канфіскаваным нумары „Пратэсту чэскага паступовага грамадзянства ў справе суду над Грамадой", у рэдакцыі знаходзіцца тэкст пратэсту францускай „Лігі абароны правоў чалавека", якога з пагляду на лёс папярэдняга пратэсту ўжо й не зьмяшчаем. Есьць вёсткі аб вынясеньні пратэсту і ў іншых культурных краёх.

Канец працэсу Грамады. Працэс Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, самы большы палітычны працэс за часу існаваньня незалежнай Польшчы — кончаны. У аўторак 22 г. траўня вынесены прыгавар. У часе, калі падаваўся матэрыял у газэту, прыгавар гэты яшчэ ня быў вядомы. Нашы чытачы доведаюцца аб ім у наступным нумары газэты з магчымым апісаньнем апошняга дня.

Агульны сход Т-ва Помачы Пацярп. ад вайны. Камітэт помачы пацярпеўшым ад вайны гэтым паведамляе ўсіх сваіх сяброў, што дня 31 траўня г. г. у памешканьні Віленскай Беларускай Гімназіі (Вострабрамская 9) у 6 гадзін увечары адбудзецца Агульны Сход усіх сяброў Камітэту.

Павестка дня: Перадача Беларускаму Дабрадзейнаму Т-ву ўсіх функцый і маемасьці Камітэту помачы пацярпеўшым ад вайны.

У выпадку, калі ў 6 гадзін не зьбярэцца патрэбны для кворума лік сяброў, паседжаньне адбудзецца праз гадзіну (ў 7 гадз. увечары) і будзе лічыцца праваможным пры ўсялякім ліку сяброў **Урад Камітэту.**

„Гаспадарчы зьвяз". Нядаўна славутны Янка Станкевіч з нялічнымі сваімі адэптамі залажыў новую арганізацыю пад вышэй паданым назовам. У склад прэзыдыуму ўвайшлі—Янка Станкевіч, Антаніна Астроўская, Юстын Мурашка і інш. Але, як чутно, гэтая арганізацыя ўраз-жа на залажэньні і распадаецца. „Дзівосы і сьмяхоты" — запраўды.

Інтэрвэнцыя пасла Валынца ў Вялейскага старасты. У зьвязку з апошнімі падзеямі на груньце адносіньня Вялейскага старасты да Т-ва Бел. Шк., пас. Валынец зрабіў інтэрвэнцыю ў гэтай справе. Было пастаўлена тры запытаньні: 1) з якой прычыны забаронена праца г-коў Т. Б. Ш. ў Вялейцы, Асіповічах, Порсе, Каловічах і Жоўтках? 2) За што наложаны штраф на грамадзян вёсак — Порса, Каловічы, Халапы і іншых — Вялейскай і Буранецкай воласьцёў? 3) Які асабісты пагляд п. старасты на будоўлю Народнага Дому ў Вялейцы?

На першае пытаньне п. староста адказаў, што праца ў пералічаных гуртках забаронена з прычыны як-бы недакладнасьцяў у рахунковасьці кніг (забраных старастам тры месяцы назад). Як перадаюць, уся „недакладнасьць" у рахунковасьці палягае ў тым, што пры стаўленьні спэктакляў ня было прыложана рахункаў на дробныя рэчы, як сьвечкі, пудру для грыму, разрахункі ў чым даваліся перад тэатральнай сэкцыяй і навет вывешваліся для ведама ў Народным Доме.

Як аказваецца — штрафы былі (у адказе на другое пытаньне) наложаны за нейкія дрэвы на дарогах (якія між іншым паламаны бурай). Згодна гутарцы старасты — каб зьняць штрафы, грамадзянам пералічаных вёсак трэба зварачвацца да п. ваяводы з абжалаваньнем.

Пагляд п. старасты на будоўлю Народнага Дому ў Вялейцы няпрыхільны (дзіва было-б, каб быў прыхільны)! П. староста вучыць, што трэба рабіць Народны Дом для ўсіх нацыянальнасьцяў (а ці гэта шкодзіць існаваньню Беларускага Народнага Дому?) і будзе дабівацца гэтага.

О, ведаем гэтыя „дабіваньні", як таксама і разьбіваньні. Адным словам—п. Вялейскі староста ня хоча ў адносіньні да Т-ва Бел. Школы ўступіць сваім іншым калегам. **Што-ж — служба, відаць, вымагае!**

Новая часопісь. Як даведваемся, хутка мае выйсьці ў сьвет новая літэратурна-навуковая часопісь, пад назовам „Водгукі".

Суд над камуністамі ў Вялейцы. Вайсковы суд разглядаў справу салдатаў 16 палка ўланаў, абвінавачваных у арганізаваньні камуністычных ячэяк ў войску. 5 абвінавачваных засуджана ад паўтара да 7 гад. турмы, 4 на год крэпасьці. Усе засуджаныя — беларусы.

17 красавіка с. г. ў м. Наваградку Наваградзкім Акружным Судом будзе разглядацца справа Аляксандра Кішкеля, Бярэзіна, Іваньсені, Ціхана, Лойкі, Мініча Ганчарэўскага, Laksіна, Малькі, Зосі Статкевічанкі і др. у лічбе 18 асоб, абвінавачаных з арт. 102 к. к. г. зн. за тое, што яны належалі да Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі і рэпрэзэнтавалі Баранавіцкі Акружны Камітэт К. П. З. Б. Усе абвінавачаныя знаходзяцца ў вастрозе.

Веча безработных у Вільні. У сувязі з увайшоўшым 15 г. траўня ў жыцьцё распараджэньнем Міністэрства Працы і Грамадзкай Апекі ў справе скасаваньня даразных дапамогаў, — 14 г. месяца мелася адбыцца вялікае веча безработных у гарадзкой залі. У апошніх мінутах перад пачаткам адміністрацыйныя ўлады забаранілі гэтае веча. Безработныя сабраліся ў Ратушы, гдзе выдзялілі трох дэлегаў, маючых скіравацца да віленскага ваяводы Рачкевіча.

Дэзэрцыя навабранцаў у Літву. Гэтымі днямі ў раёне Вежайн патруль К. О. П. затрымаў 5 асобаў, нелегальна пераходзіўшых польска-літоўскую граніцу ў кірунку Літвы. Сьледзтва паказала, што гэта — уцякаючыя ад вайсковай службы ў польскім войску.

Вялікая забастоўка ў Белавежы. Ва ўсіх белавежскіх лесапілках фірмы „Contary" выбухла забастоўка фізычных і умысловых работнікаў. Бастуе 15.000(?) чалавек. Умысловыя працаўнікі дамагаюцца павялічаньня платы ад 30 да 40 прац., фізычныя ад 30 да 85 працэнтаў.

Рэдакцыя і адміністрацыя час. „Саха" даводзіць да ведама ўсіх сваіх паважаных падпішчыкаў, што ў 1928 годзе выйшлі з друку № № 1 і 2 (сакавік—красавік) кніжкі „Саха", якія разасланы ўсім падпішчыкам. Хто з падпішчыкаў не атрымаў, няхай заразжа паведаміць аб гэтым адміністрацыю (Вільня, вул. Сьв. Ганны 2 — 3) і прышле свой дакладны адрэс.

Просім усіх паваж. гр. падпісшчыкаў, якія выслалі грошы на нашу часопісь і да гэтага часу яе не атрымліваюць нас аб гэтым паведаміць, адначасна прысылаючы свой дакладны адрэс.

Адміністрацыя Сельска-Гаспадарскай часопі „САХА".

З Т-ва Бел. Школы.

× Галоўная Управа Т-ва Бэл. Школы зрабіла захады перад Баранавіцкім старастай аб дазволе на зьезд сяброў Т-ва Баранавіцкага павету. Зьезд адбудзецца 27 траўня г.г. у м. Баранавічах а 1 гадзіне дня ў памешканьні Варшаўскага готэлю пры вуліцы Пілсудскага № 4.

Парадак дня:

1. Даклад прадстаўніка Галоўнай Управы аб працы Т-ва Бел. Школы.
2. Выбары Баранавіцкай Акр. Управы.
3. Арганізацыя бібліятэк-чытальняў і Народных Дамоў.
4. Бягучыя справы.

Гэтым Галоўная Управа апавяшчае ўсе гурткі Т-ва Баранавіцкага павету і прапануе гуртком выслаць на зьезд сваіх дэлегатаў, якія павінны мець пры сабе сяброўскія білеты. **Галоўная Управа.**

× **Браты беларусы,** сяляне і работнікі Заходняй Беларусі! Гурток Т-ва Бел. Школы ў вёсцы Сенькавічак Борка-Гічыцкай воласьці, Косаўскага павету, заклікае ўсіх братоў беларусаў, сялян і работнікаў, каму дарагая наша родная мова, хто мае спогад нашай роднай дарагой Бацькаўшчыне, дык ахвяруйце які-небудзь грош на закладзіны і будову Народнага Дому, каторы распачнецца будавацца ў вёсцы Сенькавічах! Дарагія сябры Т-ва Беларускае Школы, заклікаем мы Вас, як барацьбітаў з цемрай, як змагароў за лепшую будучыню нашага Народу, ахвяраваць, хто колькі можа, на гэты фундамант нашай роднай культуры. Усе ахвяры скіроўваць па адрасу: пошта Івацэвічы Косаў Палескі, вёска Сенькавічы, на імя Якіма Грушыка. **Прэзыдыум Г-ка Т-ва Бел. Школы ў в. Сенькавічах.**

Праца Гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

× Вёска Баравікі, Жыравіцкай воласьці, Слонімскага павету. 18 III 28 г. у вёсцы Баравікі Г-ком Т-ва Бел. Школы быў наладжаны спэктакль. На сцэне адыгралі п'есы: „Страхі жыцьця" і „Боты". Артысты выканалі свае ролі добра, ня гледзячы на тое, што першы раз былі на сцэне. Тым-жа Гуртком у в. Падмошы 22.IV 28 г. быў наладжаны другі спэктакль. Адыграны былі п'есы: „Зьбянтэжаны Саўка" і „Боты".

Артысты выканалі свае ролі вельмі добра і глядзельнікі задаволіліся іх гульнёй.

Падзякі.

× Грамадзяніну Сымону Ждановічу за ахвяраваныя кнігі ў расейскай мове для Падгаенскай бібліятэкі-чытальні ў ліку 8 экз. Управа Цырынскага Гуртка Т-ва Бел. Школы складае падзяку. **Управа.**

× **Слонімская Акружная Управа** шчыра дзякуе Юхноўскаму Г-ку Т-ва за ахвяру ў суме 27 зл. 50 гр. на карысьць беларускіх гімназіяў. **Акр. Управа.**

Абвесткі.

× Гэтым падаецца да ведама ўсіх Гурткоў Т-ва Бел. Школы ў Наваградзкім павеце, што 24 мая 1928 г. адбудзецца Павятовы Зьезд Т-ва Бел. Школы ў месьце Наваградку ў памешканьні Беларускай Гімназіі в наступнаю праграмаю:

1. Выбары сталай Акружной Управы.
2. Даклад з мейсцаў.
3. Бягучыя справы.

Наваградзкая Акружная Управа.

× Слонімская Акружная Управа зьвяртаецца да ўсіх паўнамоцнікаў, здаўшых Школьнаму Інспэктару дэкларацыі на ўрадовую беларускую школу, у як найхутчэйшым часе пераслаць у Акружную Управу копіі сьпіскаў з пададзеных дэкларацыяў, калі такія да гэтага часу не пераслалі.

Адначасна просім паведамляць Акружную управу, як праводзіліся баданьні зложаных дэкларацыяў і якія яны далі вынікі.

Слонімская Акружная Управа.
Слонім, Ражанская 55.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Праца гміннай Рады.

(Вялейская гм., Вялейскага пав.).

Калі шэсьць месяцаў таму назад жыхарства Вялейскае гміны і павету выбірала новую гм. Раду, дык кожны думаў і меў надзею, што новая Рада з беларускаю большасьцю будзе больш старанна, сьвядома і энэргічна праяўляць сваю ініцыятыву, будзе больш ахвотна падтрымліваць і бараніць інтарэсы сваіх выбаршчыкаў, а перадусім сялянства. Думалася гэтак, а сталася інакш. Аказалася, што новая гм. Рада нялепшая за старую. Ува ўсіх памылках Рады пераважна вінаваты войт. Перад выбарамі ён быў "левы", па выбарах павярнуў аглоблі „ўправа", стараецца выслужыць сабе апінію перад урадам.

Дня 11./IV. 1928 года зайшоў я прыпадкова ў гміну. Бачу: адбываецца паседжаньне гм. Рады. Мяне зацікавіла паслухаць, як вырашаюць нашы балючыя справы нашы давераныя людзі. Стаю і слухаю. Даведваюся ад пастаронніх аб парадку дзенным. Што мяне зацікавіла, выбары заступніка войта, справа гміннага будынку, які Рада ўхваліла на народны дом Т-ва Бел. Школы ў Вялейцы, раскладка дарог на Ваяводзкія, Павятовыя і Гмінныя. Пачынаюцца выбары заступніка. Пры галасаваньні падзяліліся на правых і левых. Правіца выставіла кандыдатам Мікалаевіча Савэрага, лявіца, паразумеўшыся з бышымі тут людзьмі—Нехвядовіча. Выбраны аказаўся Мікалаевіч Савэры. Якая-ж розьніца ў прапанаваных кандыдатах правіцы і лявіцы? Кандыдат лявіцы з атрымліваных 27 зл. адпускаў кожны месяц трэцюю частку на Т-ва Белар. Школы, а кандыдат правіцы поўнасьцю нічога, а навет пасьмейваўся з усяго беларускага.

Новавыбраны заступнік даў барыша Радзе, дык радны Сыракваша забраў усю гарэлку, наліваў да сваей правіцы і крычаў: Няхай жыве правіца! Правіца піла гарэлку, а лявіца пяяла Лявона і іншыя беларускія песьні. Дык ганьба вам, правіца, ваш паступак моцным рэхам адгукнецца ўсяму грамадзянству Вялейскай гміны, якое вас аклайміць, як панскіх падлізьнікаў, як наймітаў за гарэлку. Другая справа такая: Ёсьць у нас гмінны будынак, які Рада ўхваліла перавязьці ў Вялейку і выбудаваць Народны Дом Т-ва Беларускае Школы. Калі Староста гэтай ухвалы не зацьвердзіў, то было паслана да Ваяводы. Ваявода даў адмоўны безапэляцыйны адказ, так справа і памерла. Аж сёньня ізноў паявілася на парадку дзенным.

Калі паднялася першае пытаньне ў гэтай справе, дык сэкрэтар і кажа, што досыць ім радным вазіцца з гэтым будынкам, аддаць яго лепш на будоўлю школы, а не на Лукішкі. Гэтым закідам ён хацеў скампраметаваць Т-ва Белар. Школы, нібы-то з Т-ва напаўняюцца Лукішкі і што гэты Народны Дом толькі будзе далей садзіць людзей у вастрог. Радны Жоўтка запярэчыў гэтаму, кажучы: Пан сэкрэтар рад быў-бы, каб нас усіх пасаджалі ў вастрог, і стаў дамагацца, каб гэта занесьлі ў пратакол. Сэкрэтар стаў перапрашаць, што гэта ў яго гэткія шуткі. Яго падтрымліваў войт з былай „левай беларускай ідэалёгіяй". Справа пашла на галасаваньне.

Калі галасоў аказалася пароўну, войт выслаў з салі Жоўтку і большасьць аказалася на баку правых. Дык вось, грамадзяне, якая ў нас гм. Рада!

Сорам і ганьба правіцы!

Н.

„Працуюць".

(В. Рымкі, Пастаўскага павету).

Гурток Т-ва Беларускай Школы ў в. Рымкі ня можа наладзіць працу па незалежным ад яго прычынам. Сход сябраў Т-ва, які меўся адбыцца яшчэ 11 сьнежня 1927 г., быў разагнаны паліцыяй. Пры гэтым адкрылася вялізарная сетка розных панскіх лёкаяў і шпіёў навет сярод сярмяжнага люду. Адзін з такіх панскіх жабракоў, радных Антось Гінька, які сваёй агіднай брахнёй не дае супакою паліцыі і працоўнаму люду,—разьвёў брахню і на сябраў Т-ва Беларускай Школы і на самых наіўных сялян, якія яшчэ ня знаюць, што гэта знача змаганьне. Гэты вясковы Сьмердзякоў-Гінька — напісаў Пастаўскаму Старасьце, што быццам усе сябры Т-ва ёсьць бандыты, камуністы, вядуць дзень і ноч падпольную працу і кожын дзень робяць сабраньні. Староста выслаў у вёску паліцыю і сышчыкаў, як кажуць, збадаць сябраў Т-ва. Прыехаўшы сярод ночы, ну ведама, каб знайсьці сьпячых бандытаў дома, паліцыя вельмі перапалохала дзяцей і кабет, паўставіўшы ў вокна запаленыя ліхтары. Жонка солтыса была так перапалохана, што пасьля хварэла; яна ўцякала сярод начы ў суседнюю вёску, лічучы, што гэта лезуць бандыты па даляры, якія яна з мужам атрымала з Амэрыкі. Пасьля гэройскага наступленьня, паліцыя ночу ўсіх павыганяла з хаты, каб мець пакой для баданьняў спаўшых дома „бандытаў". Пры дапросах кожнага сябра выклікалі па адным, пытаючыся, дзе быў кожны дзень і кожную хвіліну і навет ставілі такія пытаньні, ад якіх і папера можа пачырванець ад сораму.

На першага мая паліцыя пільнавала вёску дзень і ноч, тлумачачы гэта тым, што вёска Рымкі бальшавіцкая.

Як бачым, браты Беларусы, сялянам у в. Рымках прыходзіцца пераносіць усялякія няпрыемнасьці цераз такога нягоднага Антося Гіньку і ягоную верную памочніцу, адну распусную мачаху з тэй жа вёскі.

Падарожны.

Вясковыя прадаўцы.

(Лідчына).

Сэрца маю каменнае, але не магу вытрымаць, больш ня маю сілы. Сусед мой Янка Жук, інтэлігент-урадовец вёў і вядзе правую агітацыю на шкоду працоўных гушчаў, а сам мае адну шостую частку разам з братам і бацькам. Здаецца, ён павінен-бы бараніць тых, хто стаіць за працоўныя масы, павінен бараніць сваіх братоў. Але ён на гэта нязгодны. Ен ідзе і бараніць тых, хто мае 8,000 дзесяцінаў, ён гэтым прадаецца і прадае адначасна імя свайго бацькі і брата.

Аднак, бацькі ня слухалі свайго паганага дзіцяці, яны ішлі за 5 кілёмэтраў і хацелі кінуць свой сял.-работніцкі нумар у часе выбараў. Але Я. Жук быў выбраны ў выбарную камісію, і наперад пабег перарабіў іначай многа мужчынскіх імен, перавярнулі на жаноцкія і не дапусьцілі галасаваць. Вось які давераны!

Яго-ж мы выбралі ў гмінную раду, дык, браточкі, такая рада для нас толькі здрада. Павыдумвалі нейкія ангельскія кнурыкі, лазьні, за што мы павінны плаціць дзесяты процант. Лазьні ў нашых вёсках нідзе не зрабілі і на цэлую воласьць, а плаціць усё роўна трэба. Хто гэта выробляе, ці ня рада? Добра на бацькавым карку ехаць! Дык вось, браты, будзьце асьцярожнымі пры выбарах, не выбірайце такіх людзей, а выбірайце тых, каторыя запраўды будуць бараніць інтарэсы сялян і работнікаў. Браты! Мо' часам і ў вас ёсьць такія шкоднікі, дык ганеце іх вон, ня дайце разрасьціся гэтаму зельлю і не дапускайце яго паміж растучых кветак. Рвеце яго асьцярожна, каб насеньне ня ўпала і больш ня вырасла гэтакага зельля. Адважна, браты, вазьмемся! Не шкадуйма грошы і не прапівайма, а лепш закладайма ў кожнай вёсцы бібліятэкі, народныя дамы, ладзьма часьцей беларускія спэктаклі, выпісвайма сваю сялянска-работніцкую газэту—, дык гэта будзе для нас карысьней, і гэтыя прадаўцы пазнаюць, што будзе сьветлая праўда панаваць.

Няхай нас не прадаюць такія Янкі, ці Міхалкі. Апрача гэтага, я шмат разоў бачыў вас, маладыя хлапцы, іграючы ў карты. Кідайце, не давайце прыкладу малым дзецям, каторыя вучацца ў школе, хаця і ў чужой. А вам, бацькі і апякуны сваіх дзетак, ганьба! Чаму не дамагаецеся роднае школы, бо ў чужой школе вашы дзеці выгадуюцца на ворагаў для свайго беларускага працоўнага народу, на такіх, як Я. Жук.

Знаны Беларус.

Пісьмы у Рэдкцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Прашу аб ласкавым зьмяшчэньні на старонках паважанай Вашай газэты некалькіх наступных радкоў.

У № 10 газэты „Narod" п. др. Я. Станкевіч зьмясьціў пісьмо, якое патытулёвана: „Адказ Dwarčaninu j „Голасу Працы". У гэтым пісьме п. др. Я. С., абгаворваючы справу інфармацыяў, паданых аб ім у газ. „Голас Працы" і характарыстыкі яго пасольскай і грамадзкай дзеяльнасьці там-жа (зусім па-мойму слушнай) і будучы, як ён кажа, „прыперты да сьцяны" піша, што—„nia ŭsie pasłowie „zmagancy" łajacca, redahujyčy „Голас Працы"... ale adzin dr. ...Dwarčanin". Пасьля гэтага дадае: „Ciapier moj adkaz robicca praściejšym: zamiest adkazawać niawiedama adkaznamu radaktaru, magu adkazać p. dr... Dwarčaninu", а затым, ужо, зварочваючыся проста да мяне, — трэбуе пацьвярджэньня яго прадажнасьці, пытаецца, чаму я не называю агідным паступкам факту непадпісаньня ўнёску клюбу „Змаганьня" іншымі беларускімі пасламі і ўрэшце—бэсьціць (і ўдае) клюб „Змаганьня" і яго тактыку ў Сойме, называючы яе правакацыяй (?), прыплятаючы сюды, што таксама „prawakacyjaj było ŭbiŭstwa Huryna, jak prawakacyjaj nadowiačy była demanstracyja kamunistyčnych polskich pasłoŭ u sali sudu".

З вялікаю неахвотаю прыходзіцца адказаць на гэтыя поўныя бессэнсоўнасьці і нелёгічнасьці, зусім беспадстаўныя і ў высокім ступені запраўды правакацыйныя выступы майго „пракурора", выступы, якія абапёрты хіба толькі на плётках ды на дзікай зоолёгічнай асабістай, ня ведама, чым выкліканай ненавісьці да мяне; выступы, якія мінаюць навет звычайную, прымітыўную этыку.

Каб ня было подпісу „dr", то можна было-б падумаць, што гэта пісаў якісь чалавек дзікі, да якога не прыстаюць ані лёгіка, ані прыстойнасьць, ані выробленая вякамі этыка, якая абавязвае пры поўных умовах усіх, больш-менш хоць прэтэндуючых на імя інтэлігентаў. Аднак, гэта піша доктар філёзофіі і галава пэўнага кірунку грамадзкай мысьлі ці хутчэй „бяссмысьліцы", якога словы прыймаюць за чыстую манэту ў пэўных колах, якія (словы) расходзяцца па ўсей Зах. Беларусі, уносячы забаламучэньні сярод чытачоў, і бэсьцяць думку працоўных і іх прадстаўнікоў, — на словы гэтыя тады я павінен і мушу адказаць, абараняючы сябе ня толькі, як чалавека, а таксама і галоўна — як прадстаўніка пэўнай часткі грамадзянства і аграмаднай, бязумоўна, большасьці працоўных Зах. Беларусі, якія мяне выбралі бараніць іх інтарэсы.

У пісьме п. Янкі Станкевіча я бачу, пад заслонай асабістага нападу на мяне — выразны паход проці ўсяе сялянска работніцкае думкі, паход безаглядны, брутальны, які не перад чым ня спыняецца, ні на што ня глядзіць. У адносінах да мяне асабіста пісьмо носіць характар яўнага дыфэмзыйнага даносу, падобны якому ўжо меў месца і належны ўчынак у адносіньні да іншых паважаных мною грамадзян, прадстаўнікоў сялянска-работніцкай думкі, якія найбольш дзякуючы гэтым даносам (з боку іншага) — сядзяць цяпер за кратамі.

Пратэстуючы проці нічым недаведзенага ні на чым ня ўгрунтованага факту майго ўдзелу ў пісаньні інфармацыяў аб п. д-ру Я. Станкевічу (пад чым крыецца і самы данос на ўдзел у „праступнай" газэце наагул)—рашуча пратэстую проці прымешваньня да звароту ў мой бок розных выдуманых ім „правакацыяў", якія маюць на мэце ачарніць і мяне, як грамадзяніна, і тую сялянска-работніцкую думку з яе прадстаўнічымі і прэсавымі органамі, якую і я маю гонар цяпер рэпрэзэнтаваць, і лічу сябе ў праве на гэтыя выдумкі адказаць. Канчаючы свой вымушаны адказ, лічу павіннасьцю сказаць аўтару „абвінавачаньня", што ён асабіста мне зусім ня цікавы, каб „lajić" яго ў газэтах і што ён дарэмна шукае ўва мне свайго асабістага ворага, якога, відаць, хоча даносамі зьнішчыць.

Вядома, пры Вашых цяперашніх „уплывах", П. Доктар, Вы шмат можаце зрабіць у гэтым кірунку, але запраўднага Вашага ворага — беларускі працоўны народ і яго думку — і Вам, П. Д-р, ня ўдасцца зьнішчыць, навет пры Вашых „мілых" здольнасьцях.

Калі Вы, Пане Доктар, грамадзкую справу хочаце пераняcьці на грунт асабісты, думаючы адыгрaцца на гэтым у вачох выбіральнікаў і беларускага грамадзянства, то ў даным выпадку Вы толькі лішні раз расьпісваецеся ў поўнай сваей палітычнай няпісьменнасьці.

Спадзяючыся, што пры Вашым характары Вы пастараецеся насылаць новыя „пісьмы ў рэдакцыю" і не жадаючы грамадзкую справу прафанаваць, пераводзячы яе на грунт асабістай палёмікі, папераджаю, што ў далейшым пастараюся па магчымасьці на Вашыя пісьмы не адказваць.

Прашу прыняць, Гр. Рэд... і г. д.

14/V 1928 г.
м. Вільня.

Д-р І. Дварчанін
пасол на Сойм.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Не адмоўце, калі ласка, зьмясьціць на старонках паважанай Вашай газэты гэтых некалькі слоў:

У № 10 газэты „Narod" зьмешчана вестка аб арганізацыі „Беларускага Гаспадарчага Зьвязу", дзе, між іншым, сказана, што я на паседжаньні 3 траўня выбраны ў Прэзыдыум названае арганізацыі.

Гэтым маю гонар давясьці да агульнага ведама, што я сам на названай зборцы ня быў і выбар мяне ў Прэзыдыум „Зьвязу", зьявіўся для мяне пэўнай неспадзянкай. З прычынаў асабістага характару я ня маю магчымасьці прыняць учасьця ў працы названай арганізацыі наагул, як і ня лічу сябе зьвязаным пастановай сходу—што да выбару мяне ў Прэзыдыум.

Прашу прыняць, Грамадзянін Рэдактар, выразы шчырай пашаны да Вас.

Эдгар Паўкшта.

Вільня, 14 траўня 1928 г.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Не адкажэце зьмясьціць на старонках Вашай паважанай газэты гэтых слоў:

Перад выбарамі ў Сойм і Сэнат для правядзеньня прадстаўнікоў у гэтыя высокія палаты была прынята праграма: „Барацьба за Беларускіх Сялян і Работнікаў".

Пад лёзунгам гэтай праграмы у Лідзкай акрузе пад № 41 прайшоў у Сойм я і д-р Янка Станкевіч.

Перад выбарамі было ўмоўлена, што на гэту арганізацыю паслы, якія прайдуць у Сойм і Сэнат пад № 41 павінны даваць па 200 злотых ад сваіх дыет у месяц — што і рабілася.

На месяц красавік я павінен быў унясьці 200 злотых. Зрабіў квіт, квіт быў зрадагаваны, паводлуг выбарнай праграмы № 41 і надпіскі, „На арганізацыю Беларускага Сялянства і Работніцтва" і запрапанаваны для подпісі паслу Янку Станкевічу, але Янка Станкевіч такі квіт адмовіўся падпісаць, тлумачучы: „што ніякай арганізацыі выбранай і камітэту Беларускіх Сялян і работнікаў ня было, а толькі „Сялянская партыя", на што і павінны ісьці грошы.

Каб не абманываць тых, хто аддаў свае галасы за партыю: „Беларускага Сялянства і Работніцтва" № 41, а не за Сялянскую партыю, я адыходжу ад працы з Янкам Станкевічам і гэтым заяўляю, што жадных зносінаў і нічога супольнага з ім і ягонай Сялянскай партыяй мець ня буду, а буду трымацца праграмы „Беларускага Сялянства і Работніцтва", пакуль не апрацую новую, болей шырокую праграму.

Пісьмо падобнага зьместу аднача сна пасылаю і ў другія рэдакцыі беларускіх газэт.

Прашу прыняць, грамадзянін рэдактар, выразы пашаны да Вас.

12/V 28 г.

Ф. Валынец
(пасол на Сойм).

Да Рэдакцыі надыйшло пісьмо ад Слонімскага Старасты наступнага зьместу:

Да адказнага Рэдактара часап. „Голас Працы" у Вільні, Віленская вул., 12—6.

Да адказнага рэдактара час. „Голас Працы" ў Вільні, Віленская 12—6.

„У № 7 беларускай газэты „Голас Працы" з дня 5/V 1928 г. у аддзеле „Карэспандэнцыі" зьмешчаны артыкул п. т. „Праца ў самаўрадзе і войт" (Старавескай воласьці, Слонімскага павету). Аўтар гэтага артыкулу, парушаючы розныя справы Старавескай воласьці, ці то знарок, ці то праз няведаньне справы дапусьціў няпраўдзівага асьвятленьня іх і тым увёў у абмылку чытачоў гэтай газэты, таму ўважаю спраставаць няпраўдзівыя факты:

1) няпраўда, што п. Павал Крынчык нібы за пашырэньне беларускай асьветы пасаджаны ў турму, а праўдай зьяўляецца, што проці Крынчыка выстаўлена абвіненьне судовае з 102 арт. К. К. за здраду стану Дзяржавы, вынікам чаго і пасаджаны ў турму,

2) згодна 80 арт. распар. Кам. Г. У. З, солтыс падпарадкуецца беспасярэдна войту, таму кантроль над яго чыннасьцю спраўляе ён-жа,

3) згодна 55 арт. п. 8 і 53 арт. успомненага распараджэньня, войт мае права ўпаўнаважыць сьцягаць падаткі асобы, якім ён даверае,

4) прыказ аб выбары солтыса не зьяўляецца компэтэнцыяй войта;

5) няпраўда, што Павятовы Аддзел счыркнуў з валаснога бюджэту 600 злотаў на стыпэндыі для беларускіх школ, а праўда, што зрабіў унёсак да пана Ваяводы аб вызначэньні Старавейскай воласьці субсыдыі з дзяржаўных крэдытаў на пакрыцьцё бюджэтнага недахопу ў суме 5.900 зл.

Для характэрыстыкі падаю зьмест пастановы Валаснай Рады Старавескай вол. з дня 9/III г. г., падпісанай раднымі: Станкевічам Адамам, Татарынам Рыгорам, Парадоўскім Сьцяпанам, Чочатам Канстатынам, Кухарчыкам Ігнатам, Мазолем Якубам, Пузачом Язэпам, Качуком Вінцэнтым і Грыўдай Міхалам:

..„Рада Старавескай воласьці на сваім паседжаньні ў справе бюджэту 9/III 1928 г. аднагалосне вынесла наступную рэзалюцыю: ацаняючы працу сучаснага Ураду ў кірунку падняцьця гаспадарчага стану вясковай люднасьці, выражае яму імем люднасьці Старавескай воласьці прызнаньне і запэўненьне як найдалей паддзержваць сучасны Урад, супрацаваць з ім, будучы пэўнымі, што гэтым збудуем сабе лепшую будучыню. Адначасна Валасная Рада пастанавіла зьвярнуцца да Пана Наваградзкага Ваяводы з гарачай просьбай ласкава паддзяржаць унёсак прысутнага на гэтым паседжаньні Валасной Рады Пана Слонімскага Старасты аб субсыдыяваньні Старавескай воласьці сумай 7000 злотаў на пакрыцьцё бюджэту 1928/29 году, якой не хапае пераважна для паддзяржаньня асьветы.

Згодна прынятай вышэй пастанове, ухваленны на паседжаньні 28 студзеня 1928 года бюджэт Прат. № 3 у звычайных выдатках у суме 49.209 зл. 50 гр. лічыць у сіле з тым, што ў звычайных даходах у аддзеле III унясьці в субсыдыі ад Ураду бюджэтнага недахопу на паддзяржаньне асьветы 7000 злотаў (сем тысяч злотаў).

Гэтае спраставаньне прашу зьмясьціць у найбліжэйшым № газэты „Голас Працы", на падставе арт. 30 і 33 расп. Прэз. П. Р. з дня 10. V. 27 г. аб прэсовым праве—у беларускай мове.

Староста
(—) Ул. Гэншэль.

Ад Рэдакцыі. Зьмяшчаючы пісьмо Слонімскага Старасты па закону — Рэдакцыя ня можа не зьвярнуць увагі нашых чытачоў на частыя спраставаньні гэтымі ўрадоўцамі нашага краю артыкулаў нашых карэспандэнтаў. Магчыма, што ў паадзінокіх выпадках нашы карэспандэнты падаюць ня зусім сьціслыя ведамасьці, на якія заінтарасаваныя асобы ў пэўны спосаб мусяць рэагаваць. Але, паміма гэтага, гэтае зьявішча, ставячае нашу газэту чуць не перад небясьпекай перарабіцца ў газэту для зьмяшчэньня ўрадавых камунікатаў, маючых характар грамадзкай апініі, — само па сабе вельмі цікавае. Па нашай думцы, гэта сьведчыць аб праяўленьні новай „маральнай палітыкі" на нашых землях, аб якой ужо ня раз гаварылася ў беларускай радыкальнай прэсе, каб не сказаць трошкі болей тут.

Што да вышэй паданага спраставаньня, то—мінаючы справу рэчовага адказу на яго да атрыманьня пэўных ведамасьцяў ад нашага карэспандэнта, якому мы ня маем права ня верыць,—зьвяртаем увагу чытачоў на тое, што п. Староста дае тут спраставаньне ў справе войта, Валаснoй Рады ды Павятовага Аддзелу.

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Селяне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

Рэдактар-Выдавец: А. Лагода.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.